БА186082 бр

БЕЛАРУСКАЕ ДОБРААХВОТНАЕ ТАВАРЫСТВА
АХОВЫ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ



# У РОДНЫМ КРАІ



Ба 186082 бр.

БЕЛАРУСКАЕ ДОБРААХВОТНАЕ ТАВАРЫСТВА
АХОВЫ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

Г.А.Каханоўскі

# У РОДНЫМ КРАІ

Дзяржаўная бібліятэка БССР

Мінск, „Полымя", 1983

КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

Рэцэнзент — кандыдат філалагічных навук
І. У. Саламевіч

Больш пятнаццаці гадоў аўтар гэтай брашуры прысвяціў пошукам невядомых багдановічаўскіх і іншых літаратурных мясцін. Працаваў у архівах, бібліятэках, сустракаўся са сведкамі далёкіх часоў. Пра пошукі адной з такіх мясцін — Ракуцёўшчыну, што на Маладзечаншчыне, і дзеліцца сваімі ўражаннямі літаратуразнавец, краязнавец і музеязнавец.

У $\frac{1905040000-010}{М306(05)-83}$ Зак. выд

© Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, 1983.

10.01.2010

Усё жыццё захоўваем у памяці дарагія мясціны, дзе жыў, працаваў ці хоць на кароткі час спыняўся праездам Максім Багдановіч. А память жа нашу запаўнялі яшчэ школьныя настаўнікі роднай літаратуры, якія з зайздроснай духоўнай шчырасцю, у што мы, безумоўна, верылі, адкрывалі перад намі свет багдановічаўскіх мастацкіх вобразаў і праўду яго чалавечых клопатаў за лёс усёй Беларусі, нават і тады, калі сам ён выразна прадчуваў свой канец. Мала тых мясцін на матчынай зямлі паэта, і запаветная мара кожнага літаратуразнаўца і краязнаўца пасправаваць адкрыць яшчэ адну, невядомую. Вось і аўтар гэтай брашуры гадоў шаснаццаць-семнаццаць назад, уважліва прачытаўшы ўспаміны бацькі Максіма, паставіў сваёй мэтай адшукаць той «хутар ці то ў Вілейскім, ці то ў Ашмянскім павеце», у якім паэт правёў два летнія месяцы 1911 года. Цяпер я, можа, і падумаў бы: а ці змагу? А тады з маладым запалам, на ўсё махнуўшы рукой, выправіўся ў пошукі. І не шкадую. Прахадзіў год, другі, ужо і край някепска пазнаў, а той хутарок па-ранейшаму заставаўся таямніцай.

Адшукаць абавязкова трэба! Бо гэтая мясціна, можа, таксама важна, як Болдзіна для Пушкіна. Багдановіч упершыню сустракаўся са сваёй нацыянальнай стыхіяй. Як гэта важна!..

Паэта чакалі ўсе беларускія пісьменнікі, загадзя дамовіліся аб арганізацыі яго адпачынку, бо хвароба даўно тварыла расправу над Максімам Багдановічам. Знайшлі яму хутарок сярод пагоркаў, каля сасновага бору, сярод жытнёвых ніваў, поруч з бруістай крынічкай і квяцістым мурожным лугам, поруч з вёскай, з яе вечарынкамі, песнямі і чысцюткай народнай мовай, каб кожны напоўнены гукамі, фарбамі і пахамі дзень мог пасля ўвасобіцца ў пругкія радкі яго будучых хрэстаматыйных вершаў...

Пошукі завялі аж у Раёўку, Альковічы. Нехта сказаў, што там жыў Багдановіч. Жыць то жыў, але які? Вечарэла, калі я вяртаўся праз Краснае дамоў пасля зноў бясплодных пошукаў. Углядаўся ў заснежана-іскрыстыя пагоркі, за якімі ў заінелай гушчыні дрэў раз-пораз выглядалі хаткі з вячэрнімі дымкамі зімовай Ракуцёўшчыны... Кіўнуў бы мне тады хоць хто-небудзь у бок гэтай невялічкай вёсачкі, і я на цэлы год скараціў бы час пошукаў.

Працуючы ў гістарычным архіве Літоўскай ССР, у вольную ад спраў часіну сустрэўся з адным тады яшчэ мне мала знаёмым чалавекам. Падзяліўся сваімі клопатамі-пошукамі.

— Максім Багдановіч падпісаў майму бацьку свой «Вянок»: «Пану... на спамін ад аўтара», — пачаў расказ Юрый Антонавіч. — Я нічога так не шкадаваў, як гэтую кніжачку. Ніколі з ёю не разлучаўся. На жаль, час не злітаваўся ні над людзьмі, ні над кнігамі. Страціўся і аўтарскі «Вянок».

— А дзе мог жыць Максім Багдановіч летам 1911 года? Дзе той не названы яго бацькам загадкавы хутарок на Вілейшчыне ці Ашмяншчыне?

— Дык гэта ж па суседству з Красным, у Ракуцёўшчыне, там трэба і шукаць сляды жыцця паэта. Прыязджаў ён тады ў Вільню па справах выдання свайго першага зборніка паэзіі і твар у твар убачыўся са сваімі завочнымі сябрамі, якіх дагэтуль ведаў па перапісцы і па іх творах. Усім віленчукам хацелася запрасіць Максіма ў госці. Прапанавалі яму адпачыць сярод лясіста-палявых прастораў каля Краснага, на хутарку поруч з Ракуцёўшчынай. Усё гэта павінна



*Гродна. Дом, у якім жыла сям'я Багдановічаў*



*Ракуцёўшчына. Дом Лычкоўскіх, у якім жыў М. Багдановіч (рэканструкцыя Л. Луцкевіча)*

было спрыяць паляпшэнню яго кволага здароўя. Верагодней за ўсё, што Багдановіча суправаджаў у тую ціхую мясцінку беларускі археолаг і арганізатар беларускага музея ў Вільні Іван Іванавіч Луцкевіч.

Размова незвычайна абрадавала, акрыліла — уваччу паўставала Ракуцёўшчына. Хутчэй у запаветную вёсачку, як мне здавалася, там людзі ўсё скажуць і пакажуць. У аўтобусе яшчэ раз перачытаў важнейшы для мяне ўрывак з успамінаў Адама Ягоравіча, бацькі паэта.

«...Яго (Максіма — Г. К.) цягнула ў Беларусь, дзе яму хацелася пазнаёміцца асабіста з беларускімі пісьменнікамі і дзеячамі па беларускім адраджэнні, якія, між іншым, у пісьмах абяцалі яго ўладкаваць у якой-небудзь сухой мясцовасці з сасновым лесам. Я, разумеецца, нічога супраць гэтага не меў, і ён адправіўся ў Вільню ў палавіне чэрвеня (1911) адразу ж па выхадзе з гімназіі. Паездка прадаўжалася два месяцы з невялікім і ўзбагаціла яго жывымі назіраннямі роднага краю, азнаёміла з яго жыхарамі і дзеячамі, увогуле паставіла твар у твар з жывой рэчаіснасцю, якую да гэтага часу ён ведаў па кнігах або расказах маіх сясцёр, яго цётак. Частку часу ён правёў у Вільні, жывучы ў кватэры сакратара рэдакцыі «Нашай нівы», а затым на якімсьці хутары ці то ў Вілейскім, ці то ў Ашмянскім павеце»[1].

З Краснага да запаветнай вёсачкі як рукой падаць. Мінаю ўзгорак — і ў нізінцы Ракуцёўшчына — купка хат, ледзьве вырысоўваюцца дзве-тры вулачкі

[1] Шлях паэта. Мінск, 1975, с. 28.



*Стары вакзал станцыі Вуша, куды прыязджаў і адкуль адпраўляўся М. Багдановіч*

ды са два маленечкія завулачкі. Крыху воддаль адлучылася яшчэ некалькі хат, якія па-тутэйшаму называюць падкрасненскімі, а каля дарогі Краснае—Чысць— калгасныя фермы.

Падышоў да гурту жанчын, якія ўвішна схіліліся над бульбай каля раскрытых капцоў — адбіралі насенку. На маю просьбу — хто б змог мне расказаць пра дарэвалюцыйную Ракуцёўшчыну — жанчыны пачалі ўслых называць імёны і вясковыя мянушкі ўсіх дзядуляў і бабуляў. А сышліся ўсе на адным чалавеку — Вінцуку Есьмановічу, сказаўшы: «Ён пісьменны, яшчэ за царом у Красненскую школу хадзіў, мае добрую памяць, праўдзівы чалавек, яму можна верыць». З такой атэстацыяй добрага дзесятка ракуцёўцаў іду да старога.

Разважлівы Вінцук Есьмановіч няспешна «робіць падарожжа» ў свае маладыя гады. Прыгадваў тую Ракуцёўшчыну, якая жыла ў ім памяццю далёкага дзяцінства. Жонка нечым дапаўняла мужа, расказвала пра нейкія здарэнні з даўно мінулых гадоў. Потым дзед Вінцук зняў з цвіка кепку, звычайным жэстам націснуў яе на лоб і вывеў мяне на двор: маўляў, тут больш прастору для думкі і гутаркі.

— Там, дзе цяпер хата Валодзі Грышаля, — паказаў Вікенці Мікітавіч у бок Краснага, — стаяў ладны старасвецкі будынак Лычкоўскіх... З Вільні госці ў яго бывалі, можа і з рэдакцыі, але тут стала жылі толькі Лычкоўскія.

Апошнюю фразу я прыняў насцярожана: ці не перабольшвае чаго мой субяседнік. Але слухаю далей.

— Дом быў не панскі, зроблены па даўнейшай модзе, мала чым адрозніваўся ад нашых вясковых хат. Можа, трошкі далікатней выглядаў. Мелася



*Адкрыццё «помніка дарозе», па якой хадзіў і М. Багдановіч*

некалькі пакояў, кухня, спіжарка (кладоўка — Г. К.), пры доме была такая ж старая, замшэлая веранда, невялікія вокны. Запомнілася мне тое, што на страсе быў комін, у той час як у нашых сялянскіх хатах гэта лічылася раскошай і дым ішоў проста ў сені. Ад дома вяла сцежка, абапал якой раслі прысады. Зямлі ў гэтага гаспадара было меней, чым у суседніх. Але дзяцей не было, растрат ніякіх не мелі, дык жылі заможна. На вялікі жаль, — разважае далей Віцук Есьмановіч, — няма ў жывых той (аднаго ці двух чалавек) прыслугі, якая б расказала куды болей за мяне і пацвердзіла б знаходжанне Максіма Багдановіча ў гэтым фальварку, бо сам жа я таго года служыў у царскім войску, хоць і расказвалі мне, што прыязджаў сюды паэт маладзенькі, надта слабы здароўем.

Нешматслоўны паважны дзядок — увесь ад беларускай вёскі — расказаў пра кожны закутачак ракуцёўскай зямелькі. Хто купляў, калі купляў, каму ў пасаг аддадзена... Кожная вулачка мае сваю назву і нават маленькую гісторыйку, якая з часамі «абрастала» новымі легендамі і перадавалася маладзейшым пакаленням вяскоўцаў, а тыя ўнукам... Кожная сядзіба абласкана ў паданнях старажылаў.

— Калі ў Ракуцёўшчыне хату хто купляў, то за легенды грошы набаўляў. Во іх колькі ў нас! — на твары старога чалавека засвяцілася ўсмешка. — Мае ракуцёўцы, напэўна, шмат іх нагаварылі Максіму Багдановічу. А было ж тады ў нас нямала галасістых пяюх і гутарлівых дзядзькоў.

Тое, што зараз бачыцца і што было раней, — гэта ўжо істотная розніца! Дарэвалюцыйная вёска, вядома ж, не горад, і яна на працягу двух-трох дзесяцігоддзяў не мяняе свайго выгляду. Таму пэўнае ўяўленне пра даўнейшую Ракуцёўшчыну можа даць польскі «Слоўнік геаграфічны...». У томе дзявятым, які выйшаў у 1888 годзе, чытаем, што тут быў фальварак з адным домам, у самой жа вёсцы жыло 37 душ. Тады гэта была ўласнасць Стацэвічаў. Бліжэйшая паштовая станцыя — Краснае.

Мясціна змянілася. Няма таго бору, што з захаду падступаў да Ракуцёўшчыны. Даўно перарабілі той «старасвецкі дом». У ім жыве новае пакаленне людзей. Зараз гэта хата Уладзіміра Андрэевіча Грышаля. Гаспадара застаў за работай: усёй сям'ёй бялілі, малявалі, мылі — рыхтаваліся да свята.

— Ці не маглі б сказаць, дзе стаяла старая хата Лычкоўскіх?

— Той фальварковы дом прастаяў да канца 50-х гадоў. Тады я задумаў яго абнавіць: памяняў трохі падгніўшыя падрубы, паклаў новую падлогу. Але гэта той самы дом, бо дрэва аказалася яшчэ такім моцным, што я з таго ж матэрыялу і амаль па тым жа фасоне і на той падмуроўцы зноў адбудаваў. Нават шалёўка тая самая. Тыя ж старыя вокны паставіў, — паказаў Уладзімір Андрэевіч на старыя фігурныя скобы ў фортках. — У гэтыя вокны глядзеў Максім Багдановіч. Усё гэта з той пары. Хата стала толькі на два метры карацейшая. Ранейшая была адзінаццаць метраў даўжыні, а зараз дзевяць. Адкінуў ранейшыя сені.

Гаспадар вывеў у кухню і паказаў, дзе была ранейшая спіжарка, ад якой засталася толькі падмуроўка.

На вуліцы У. А. Грышаль паказаў, дзе рос вялікі разложысты ясень, дзе былі прысады, ад якіх толькі нешта вельмі сціплае ўгадваецца, — у калдобінах ад сучаснай тэхнікі сцяжынка ды пара ліп. Бліжэй да хаты засталіся тры адзічэлыя пакручастыя яблыні, таксама памятка тых дзён. На задзірванелай сядзібе ўжо сынам Уладзіміра Андрэевіча пасаджана чародка клёнікаў. Бо старыя даўно парадзелі. Толькі адзін, як волат, і зараз сваім ценем ахінае стара даўнюю студню, з якой піў ваду Максім Багдановіч.

А крынічка? Ёсць і яна. Ракуцёўцы дагледзелі яе, збудавалі над ёй стрэшку, прыкрылі ад забруджвання. І зараз, як і 70 гадоў назад, крыштальна чыстая прыемная вада. Няма ўжо і даўнейшага пруда ў канцы саду, але з'явіўся новы, які запаўняе ўсё тая ж крынічка.

Перабудаваліся сядзібы суседзяў Лычкоўскіх — Таргонскага і Зяневіча. Змяніўся іх выгляд, але стаяць хаты на тых жа самых мясцінах.

Ідзём той жа дарогай на Краснае, якой хадзіў і Максім Багдановіч, самай блізкай, праз горку. І тут змяненні. Знік той даўні замшэлы высокі драўляны крыж, які ў часы М. Багдановіча стаяў паміж стройных ясеняў і клёнаў, пры самай дарожцы.

Пейзажная маляўнічасць тут выключная. Цікава, ці не пісаў пра гэта сам М. Багдановіч у пісьмах свайму бацьку і сябрам? Знайсці б гэтыя пісьмы...

Калі на зямлі сёе-тое памянялася, то напісанае тут Вялікім Паэтам засталося нязменным — таленавітым помнікам беларускай літаратуры. У гэтай ціхай вёсачцы адчыняліся яму глыбіні тагачаснага свету, сакавіта, аб'ёмна і шматфарбна паўставала перад поглядам жыццё роднай Беларусі. Ён падстаўляў свой малады твар ласцы сонца, яго супакойваў блакіт высокага неба, гоман бору сасновага. А мова! А шчырасць душ людскіх! Усё гэта цешыла Максіма Багдановіча і з'яўлялася дарогай да акіяна жывой рэчаіснасці.

Ды ці толькі гэта? Хочацца верыць, што тут пісаліся Максімам Багдановічам такія радкі твораў, як «І зноў пабачыў я сялібы...», «У вёсцы», а магчыма і «Дзед» ці вершаванае апавяданне «Вераніка», асабліва вось гэтыя радкі:

> Устае перад маім паглядам
> І вулка, веючая сном,
> І ціхі старасвецкі дом
> З цяністым, адзічэлым садам;
> Над ім шпакоўніца ўгары,
> А ўкруг схіліўся тын стары.

Як гэта пераклікаецца з тым, аб чым расказваў Вікенці Мікітавіч Есьмановіч.

Плённы ракуцёўскі перыяд жыцця Максіма Багдановіча яшчэ не раз будзе інтрыгаваць даследчыкаў таямнічасцю яго творчай спадчыны. Адкрыюцца новыя факты, з'явяцца арыгінальныя доказы і меркаванні, будуць рабіцца да-

лейшыя аналізы і сінтэзы, як і належыць у такіх выпадках. Па меркаванню даследчыцы Н. Б. Ватацы і паводле ўспамінаў сакратара рэдакцыі «Нашай нівы», «паэт напісаў на вёсцы цыклы вершаў «Старая Беларусь» і «Места» і паэмы «У вёсцы» і «Вераніка», якія пазней у кнізе «Вянок» склалі цыкл «Мадонны». Гэта значыць, за два месяцы паэт напісаў семнаццаць вершаў і дзве паэмы. Ведаў аб гэтым сакратар са слоў самога паэта, які з Ракуцёўшчыны ехаў зноў праз Вільню»[1]. На вялікі жаль, паэма «У вёсцы» страцілася ці па дарозе ў «Нашу ніву», ці ў самой рэдакцыі, і ракуцёўскі варыянт толькі двума гадамі пазней М. Багдановіч узнавіў, аб чым паэт паведамляў, што «чарнавіка апошняй (паэмы «У вёсцы» — Г. К.) няма, аднак, здаецца, патраплю зноў напісаць». А як шмат і пазнейшых твораў пісалася пад светлым уражаннем ад жыцця сярод «крыніц натхнення», якія толькі ёсць у родным краі. Велічнасць характару сапраўднай мадонны разгледзеў геніяльны паэт у простай сялянскай дзяўчыне:

...і ў гэты час яна,
Здавалася, была аж да краёў паўна
Якойсь шырокаю, радзімаю красою,
І, помню, я на міг пахарашэў душою.

Пад саламянымі стрэхамі хацінак М. Багдановіч убачыў слёзы тугі па рана страчаным чалавеку, бядоту сялянскую, чуў радасць святочнага дня, жарты тутэйшых веселуноў... Усё тут было як і ўсюды і ва ўсіх людзей. Патрыятызм даваў яму магчымасць усё правільна зразумець і ацаніць. Тым больш прыемна ўсведамляць, што жахі жыцця не спужалі паэта, ён смела ўглядаўся ў будучыню. Марыў і пра долю людскую, і пра ўздым беларускай літаратуры і давядзенне яе да лепшых сусветных узораў і сам, найперш, ажыццяўляў высакародную задуму, падымаў важныя тэмы, выяўляў сябе ў адпаведных жанрах, вывяраў у дакладнасці думкі, шукаў патрэбнае народнае слова.

Пры новай сустрэчы са старажылам доўга мы яшчэ гутарылі пра мясцовую старасветчыну. І як мала, на жаль, захавалася з той даўняй красы: нашкодзілі войны, пажары, час. Напэўна, найбольш дакладна мог абмаляваць гэты куток сам Максім Багдановіч у пісьме свайму бацьку. Вядома, гэта толькі меркаванне. Разважаем і пра тое, як мог дабрацца сюды паэт. Сышліся на адным варыянце: да станцыі Вуша мог ехаць цягніком, а тут і пехатою недалёка.

— Шмат памянялася ў Ракуцёўшчыне гаспадароў, — сказаў на развітанне дзед Вінцук. — Той багдановічаўскі дом трохі рэканструявалі пазнейшыя гаспадары Грышалі. Усё ж для нас найбольшы гонар — Максім Багдановіч. Мы рады, што і наша Ракуцёўшчына хоць неяк увайшла ў яго паэзію.

Падзякаваў старому за прыемную гутарку, і ён ужо нялёгкай хадой пайшоў дамоў. Паглядзеў яму ўслед і падумаў: ён жа амаль равеснік Багдановіча. Проста не верыцца, што такім вось дзедам мог быць і Максім. Не. Паэт застаўся навекі маладым.

Пакуль што пра ракуцёўшчынскі перыяд жыцця і творчасці нашага слаўнага Максіма Багдановіча мы ведаем малавата. Шмат сведкаў, як тутэйшых, так і тых, хто яго сустракаў у Вільні і праводзіў на маладзечанскую зямлю, адышло ў нябыт. Ды і пра загадкавы хутарок гутаркі толькі пачатак.

Пасля маёй першай публікацыі ў газеце «Літаратура і мастацтва» 26 ліпеня 1966 года пра Ракуцёўшчыну тут пабываў Алесь Бачыла, аўтар лібрэта оперы «Зорка Венера». Пазней з'явілася публікацыя Ніны Ватацы, скрупулёзнай збіральніцы багдановічаўскай спадчыны. Я сам яшчэ не раз ездзіў у Ракуцёўшчыну, вазіў з сабой мастака Кастуся Харашэвіча, каб зрабіў эцюды таго маляўнічага хутарка...

Прайшоў час, а адчуванне нечага недасказанага, неўстаноўленых нейкіх фактаў жыцця паэта ў Ракуцёўшчыне не давалі спакою. Перабіраў свае раней-

[1] Ніна Ватацы. А сэрца ўсё імкне да бацькоўскага краю... «Маладосць», 1981, № 6, с. 178.

шыя запісы, сустракаўся з новымі людзьмі, перапісваўся, чытаў новыя крыніцы па багдановічазнаўству, сядзеў у архівах. Толькі пасля такога ўсебаковага даследавання мушу прызнаць сваю віну, што не зусім быў дакладным у сваёй першай публікацыі, памылкова назваўшы ўладальніка невялічкага ракуцёўшчынскага фальварка, у бытнасць якога і жыў Максім Багдановіч. Услед за мной такую ж памылку паўтарыў Алесь Бачыла, аб чым вельмі шкадую і перапрашаю.

Давялося яшчэ раз патурбаваць сваімі роспытамі даўняга знаёмага — віленчука Юрыя Антонавіча. І ён параіў зацікавіцца асобай уладальніка фальварка, які фактычна ажыццяўляў запланаваны адпачынак Максіма Багдановіча ў Ракуцёўшчыне.

Тут належыць шчыра падзякаваць і роднаму брату Юрыя Антонавіча — Лявону Антонавічу, які сам энергічна падключыўся шукаць сляды жыцця М. Багдановіча ў Ракуцёўшчыне, выяўляў немаліх сведкаў. І небеспаспяхова. Мы разам з ім здзейснілі падарожжа ў колішні фальварак. Паводле уласных успамінаў і ўспамінаў старажылаў, ён зрабіў рэканструкцыю-малюнак старой сядзібы Лычкоўскіх, які тут і падаецца.

Уладальнікам ракуцёўшчынскага фальварка быў Вацлаў Эмярыкавіч Лычкоўскі. Толькі нядаўна, перапраўляючы свае ранейшыя запісы, я ўспомніў, што і нябожчык Вінцук Есьмановіч (памёр ён у 1979 годзе) называў уладальнікам Лычкоўскага, да якога даўнія віленчукі-нашаніўцы ехалі ў госці, як да сябе дамоў.

Трэба зверыцца з ранейшымі публікацыямі, у якіх ёсць хоць крыху «інфармацыі з першых рук». Адным з такіх ранніх даследчыкаў застаецца Максім Гарэцкі. Не можа быць, каб ён, працуючы над сваёй «Гісторыяй беларускай літаратуры», таксама не ўспомніў факта прыезду Максіма Багдановіча ў Вільню летам 1911 года.

«...Быўшы студэнтам, ён (Максім Багдановіч — Г. К.) ужо ўсёй душой аддаўся беларускай літаратурнай творчасці, апрача таго, пісаў аб беларускіх справах у расейскіх і асабліва шмат у украінскіх часопісах. Як пішуць асабіста знаўшыя яго людзі (З. Бядуля), цяпер Багдановіч «зайздраваў тым шчасліўцам з беларускіх паэтаў — дзяцей сялян, што хоць пастушкамі былі, але ў родным полі, у родным лузе, у сваіх лясах, пушчах і балотах. Павэдлуг яго здання, песняры, жыўшыя ў самых глухіх кутох роднай зямлі, маглі ўбіраць у сябе творы, самабытны, абвеяны казкамі дух свайго народу». Ён з нецярплівасцю чакаў таго часу, калі здолее паехаць і першы раз пабачыць бацькаўшчыну і першы раз пачуць яе жывую мову. У 1911 годзе ён меў, як сам казаў, «вялікае шчасце»: ён пабачыў бацькаўшчыну і прыехаў на колькі дзён у стары культурны цэнтр — Вільню. З незвычайнай радасцю пераказваў тут паэт сваім знаёмым, што гэта было для яго за шчасце, бо далёкая нязнаная бацькаўшчына — Беларусь неяк дзіўна чаравала яго і вабіла к сабе ад таго часу, як ён пачаў жыць свядомым жыццём; самае імя яе будзіла ў душы паэта дзіўны стан і здавалася яму, што вось-вось брызнуць слёзы з яго вачэй»[1].

Як бачым, яшчэ задоўга да таго часу, як напіша ўспаміны Адам Ягоравіч Багдановіч, Максім Гарэцкі прыгадвае гэты факт у сваім падручніку беларускай літаратуры. Усё астатняе трэба даследаваць на месцы, наколькі гэта дазваляюць магчымасці. Перш за ўсё — хто ж такія былі Лычкоўскія?

Старэйшаму — Вацлаву Эмярыкавічу Лычкоўскаму ў 1911 годзе было каля пяцідзесяці (памёр прыкладна ў 1926—27 гг. — Г. К.), крыху маладзей была яго сястра Ядзя (па мужу Русецкая, памерла пад час нямецкай акупацыі ў 1942 годзе — Г. К.). Дом іх быў ладны і гаспадарка някепская, даволі моцная. Самі паходзілі з даўно збяднелай шляхты, той, што самі зямлю абраблялі. Вацлаў Лычкоўскі быў вельмі спагадлівым і дарадлівым чалавекам, даводзіўся родным дзядзькам беларускаму археолагу і музеязнаўцу Івану Луцкевічу, які стаў пасрэднікам ва ўладкаванні Максіма Багдановіча ў Ракуцёўшчыне. Гаспадары фальварка стараліся стварыць найлепшыя ўмовы для жыц-

[1] Максім Гарэцкі. Гісторыя беларускай літаратуры. Вільня, 1920, с. 173—174.

ця і творчасці. Ядвіга (ці Ядвіся, як яе звалі дома) Лычкоўская-Русецкая таксама даглядала за маладым беларускім песняром.

Тым летам 1911 года ў Ракуцёўшчыне жыла мінская пляменніца Вацлава і Ядвісі Лычкоўскіх — Эмілія Іванаўна Шабуня (1886—1974) з дачкой Янінай. Зараз ужо Яніне Аляксандраўне далёка за семдзесят, і яна прыпамінае тое лета як вельмі рамантычнае, вясёлае. Паводле ўспамінаў яе маці тым летам адбываліся даволі забаўныя сцэнкі, бо ў Максіма закахалася тады яшчэ маладая цётка Ядвіся: «Калі я (Ядвіся — Г. К.) яму прапаную шклянку гарбаты, ён не п'е, а калі ты — ніколі не адмаўляецца». Максім Багдановіч насіў тады для паважнасці бараду і выглядаў трохі сталей паводле сваіх юначых гадоў. Як піша Лявон Крывіцкі, беларускі паэт не падзяляў захаплення тагачаснай моладзі рускім паэтам Надсанам, паколькі апошні пісаў на эратычныя тэмы. Жыў М. Багдановіч у Ракуцёўшчыне не ў «вялікім» доме, не разам з усімі, а ў маленькім дамку ў садзе. Гэта мусіць таму, што разумеў небяспечнасць сваёй хваробы. Праўда, есці збіраліся ўсе разам у «вялікі» дом. Часам і на шпацыр таксама хадзілі ўсе гуртам. Максім часта браў на рукі Янінку і расказваў ёй казкі, і гэта яе вельмі цешыла. Цікава, што сямейная традыцыя ўшанавання памяці паэта прадаўжаецца і зараз. Унук Яніны Аляксандраўны Багдан — здольны самадзейны спявак, выконвае багдановічаўскую «Зорку Венеру».

Паездка 1911 года ў Беларусь пакінула ў душы паэта незаменную асалоду-памяць. Вось як пра гэта пісаў яго бацька: «Паездкай ён быў вельмі задаволены, і, вядома, яна была надзвычай плённай для яго паэтычнай дзейнасці. Калі вярнуўся, ён шмат расказваў пра падзвіжнікаў беларускай літаратуры, аб тых няшчасцях, якія яны перажываюць, аб недахопах сродкаў, аб бескарыслівым служэнні роднаму слову шматлікіх работнікаў, галоўным чынам з асяроддзя настаўнікаў, ...пра Вільню і яе старыну і пра тое ўражанне, якое яна зрабіла на яго, пра віленскія калекцыі слуцкіх паясоў, якія ён там бачыў і якія, напэўна, натхнілі яго на напісанне «Слуцкіх ткачых».

Сапраўды, нават кароткатэрміновае знаходжанне М. Багдановіча ў старажытнай Вільні дало яму вельмі шмат, узбагаціла і асвяжыла памяць. Калекцыянер-энтузіяст І. І. Луцкевіч, як вядома, збіраў усё жыццё разнастайныя беларускія скарбы: слуцкія паясы, старажытную зброю, рукапісныя кнігі, старадрукі, запісы фальклору, народную вопратку, музычныя інструменты і іншыя помнікі этнаграфіі, археалогіі, гісторыі і культуры, якія тады мясціліся ў будынку рэдакцыі «Нашай нівы» (Завальная, 7) і пазней сталі экспанатамі Беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея ў Вільні. Навукова грунтоўную экскурсію правадзіў той жа натхнёны збіральнік і падарожнік, археолаг і этнограф Іван Іванавіч Луцкевіч. Няцяжка здагадацца, што цыклы вершаў «Старая Беларусь», асабліва «Слуцкія ткачыхі», ды і «Места», «Перапісчык», «Летапісец», «Кніга», «Безнадзейнасць» і іншыя пісаліся ў Ракуцёўшчыне пад свежымі ўражаннямі ўбачаных помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Паэту было дорага ўсё: і славуты слуцкі пояс, і бярдыш, і каменная сякера, і адамкнутыя ўласнай рукой срэбныя засцежкі старой кнігі, якая была напісана «кірыліцай прыгожай».

І бачу я ў канцы няхітрую прыпіску,
Што «кнігу гэтую раб божы, дзяк Гапон,
Дзеля душы спісаў у месце Ваўкавыску
У рок сем тысяч сто васьмы з пачатку дзён».

На гэтыя рэліквіі глядзелі і іншыя пісьменнікі, але толькі высокая багдановічаўская культура змагла таленавіта трансфармаваць тое адвечнае ў літаратурную з'яву. Якраз гэты бок — гістарызм М. Багдановіча — высока ацанілі вядомыя гісторыкі, як У. І. Пічэта, М. М. Улашчык і іншыя. У даследаванні «Звенні» (1976) беларускі крытык Рыгор Бярозкін пісаў: «Кожная нацыянальная паэзія раней ці пазней ажыццяўляе пераход ад рамантычна-інтуітыўных «праглядаў» гісторыі, ад пошукаў аналогій у мінулым да сапраўды

рэалістычнага гістарызму. У беларускай паэзіі гэты пераход звязаны перш-наперш з імем Максіма Багдановіча, аўтара твораў накшталт «Безнадзейнасці». Як даніна павагі да вялікага паэта ў 90-ыя ўгодкі з дня нараджэння ў бюлетэні «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» (1981, № 4) прагучала цікавае выступленне «Яму была падуладна» (М. І. Ермаловіч), у якім гаворыцца: «Выдатнае веданне гісторыі Беларусі М. Багдановіч найперш выкарыстоўваў у барацьбе за паспяховае развіццё беларускай культуры, літаратуры, у палеміцы з тымі, хто імкнуўся закрэсліць беларусаў як народ. З аднаго боку, ён змагаўся супраць тых, хто выношваў планы апалячання беларусаў-католікаў. З другога боку, ён гнеўна бічаваў тых, хто, не ведаючы канкрэтных умоў, браўся «выратоўваць» беларусаў ад паланізацыі русіфікацыяй... Максім Багдановіч лічыў, што самай надзейнай гарантыяй ад гэтай пагрозы можа быць толькі свабоднае развіццё беларускай мовы, асабліва яе ўжыванне ў сельскіх дзяржаўных установах і вывучэнне ў школах... М. Багдановіч глыбока разумеў, што веданне народам сваёй гераічнай гісторыі дазволіць яму хутчэй наблізіць светлую будучыню»[1]. Паэт верыў у развіццё беларускай культуры, што яна — «глыбока жыццёвая з'ява, якая знаходзіцца ў рэчышчы агульнаеўрапейскага прагрэсу». Гэтая багдановічаўская ідэя найбольш яскрава прагучала ў яго артыкулах: «На беларускія тэмы», «Беларускае адраджэнне», «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця», «Аб веры нашых прашчураў», «За сто гадоў», «Аб гуманізме і неабачлівасці», «Хто мы такія?», «Славянскі свет» і іншыя. І ў гэтым таксама азваўся зарад творчай энергіі, які дала М. Багдановічу паездка ў Беларусь.

У пэўнай меры праліваюць святло на сэнс паездкі паэта ў Беларусь пісьмы яго бацькі да чалавека, якога ён кожны раз велічаў «дарагім земляком». З гэтай перапіскі, выяўленай намі ў архіўна-бібліятэчных сховішчах Вільнюса, яшчэ раз, можа больш яскравей, абмалёўваецца тая сітуацыя, у якой знаходзіўся Максім Багдановіч.

Пасля смерці сына Адам Багдановіч дзякаваў за выдадзены «Вянок». «...Гэта трэба было зрабіць дзеля памяці нябожчыка. Аддаваў ён непадзельна сваё харошанькае жыццё паэтычнаму служэнню сваёй Радзіме, свайму народу. Гэта было ахвяравальнае служэнне, род асуджанасці — і ў гэтай справе ён рэдкі прыклад: яго вершы — сапраўды выпакутаваныя вершы. Вядома, не ўсё з напісанага трапіла ў друк, але ўсё ж дастаткова поўна будзе ўяўляць кніга яго пакутаў. Наўрад ці дачакаюся паўторнага выдання... і таму радуюся, што нарэшце гэтае выданне ажыццявілася». І далей Адам Ягоравіч піша: «Хацелася б мне адказаць вам на роднай мове, якой я валодаю як трэба, але мяне абцяжарвае нязвыклая арфаграфія».

У наступным пісьме А. Я. Багдановіч расказаў, як ён дапамагаў (калі гэтае слова можна тут ужыць у прамым сэнсе — Г. К.) свайму сыну працаваць над мовай верша. «...Я яму (Максіму — Г. К.) радзіў, дзе не хапала беларускага слова, запазычваць і ўсвойваць у беларускай мове расейскія словы, як больш блізкія і зразумелыя беларусам, а не хадзіць у пазычкі да чужога дзядзькі, як гэта робяць многія сучасныя беларускія пісьменнікі»[2].

А. Багдановіч так і не зразумеў усіх цяжкасцей беларускай інтэлігенцыі, у тым ліку і свайго сына, беларускай літаратуры і мовы, якая выпрацоўвалася, шліфавалася, імкнулася да гарызонтаў еўрапейскай культуры. Ды ён і пасля смерці свайго сына не ўпусціў моманту кінуць дакор беларускім пісьменнікам за тое, што яны ўжываюць словы «зусім», а не «саўсім», «вось», а не «вот» і назваў іх «засцянкоўшчынай». Ці не таму Максім часцей звяртаўся за парадамі да сваёй цёткі, чым да бацькі. Сын імкнуўся да сапраўдных крыніц беларускай мовы.

Вось чаму Максіму Багдановічу вельмі і вельмі не хапала Беларусі, ён імкнуўся ў Вільню, да ніў беларускіх і ў тую ж сціплую Ракуцёўшчыну.

---

[1] М. І. Ермаловіч. Яму была падуладна. «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». 1981, № 4, с. 23.
[2] Рукапісны аддзел Дзяржаўнай бібліятэкі АН Літ. ССР, ф. 21, спр. 176, л. 17.




*Памятны знак у Ракуцёўшчыне, поруч з якім узнік малады «Максімаў сад»*

Трэба прадоўжыць пошукі. А пакуль што варта адзначыць імя вялікага паэта ў сціплай вёсачцы Ракуцёўшчыне, каб заадно гусцела літаратурная карта Беларусі. У чэрвені 1977 года па прапанове Мінскага абласнога краязнаўчага музея ў Маладзечне і пры самым дзейсным удзеле заслужанага работніка культуры БССР Вячаслава Антонавіча Ляшковіча на ракуцёўшчынскім пагорку ўзнік помнік — два камяні: адзін як вечная свечка, другі як п'едэстал, на якім адліты радкі з Максімавага верша:

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзіла і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

А крышачку вышэй надпіс: «У в. Ракуцёўшчына ў 1911 г. жыў і працаваў вядомы беларускі паэт Максім Багдановіч».

На святочную ўрачыстасць адкрыцця помніка Вялікаму Паэту прыйшлі людзі з усяго наваколля: з Ракуцёўшчыны, Краснага, Чысці, Касцюшак — тых мясцін, дзе некалі любіў ён гуляць, думаць, працаваць. Прыехалі і госці з Мінска — беларускія пісьменнікі Ніл Гілевіч, Іван Чыгрынаў, Пятрусь Макаль, Мікола Ермаловіч і іншыя. Мноства кветак, узнёслых слоў, добрых вершаў — Яму ў памяць. Гэта прыдатнае месца, куды можна прынесці любімыя Максімавы васількі. Тут ёсць магчымасць арганізоўваць і праводзіць багдановічаўскія чытанні, яго святы паэзіі.

Выказвалася добрая думка — пасадзіць на ракуцёўшчынскіх узгорках першы на беларускай зямлі пісьменніцкі парк — кожны літаратар па дрэўцу. І гэтая мара таксама стала явай. 24 красавіка 1981 года вядомыя беларускія пісьменнікі Ніл Гілевіч, Алесь Бачыла, Пятрусь Макаль, Яўгенія Янішчыц і іншыя ўрачыста заклалі «Максімаў сад». Першыя семдзесят дрэўцаў — па ліку гадоў, якія аддзяляюць ад той пары, калі тут жыў, хадзіў, думаў М. Багдановіч. Да стагоддзя паэта разрасцецца першы на Беларусі пісьменніцкі парк-помнік.

Акадэмік Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі прапанаваў уздоўж брукаванай дарогі, якая вядзе ад помніка М. Багдановічу ў Красным да Віленскага гасцінца, выкласці валуны. На кожным з іх выбіць назвы твораў паэта. Сапраўды, думка вельмі слушная, і яе трэба не толькі падтрымаць, але абавязкова ажыццявіць, каб яшчэ больш святочным і светлым быў краявід.

Доказам неардынарнасці Максіма Багдановіча ў беларускай літаратуры і культуры наогул стала яго юбілейнае свята 90-годдзя з дня нараджэння, якое так шчыра і ўрачыста праходзіла хіба што ў гонар Янкі Купалы і Якуба Коласа.

9 снежня 1981 года ў Мінску на галоўнай паркавай алеі перад оперным тэатрам, поруч з той запаветнай мясцінкай, дзе з'явіўся на свет Максім Багдановіч, (на былой Траецкай горцы) прылюдна адкрылася бронзавая велічная постаць-помнік паэта, аўтарам якой з'яўляецца заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Сяргей Вакар. Да падножжа помніка ляглі гваздзікі. Трэцяя літаратурная постаць адзначылася на карце горада, ушанавана яшчэ адна памятная мясціна.

Вечарам гэтага ж дня ў будынку Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета наладзілася вялікая багдановічаўская ўрачыстасць. Мест вольных тут не было, як і не было тады, калі на сцэне гэтага ж тэатра ішла опера «Зорка Венера». На свята вялікага паэта прыязджалі госці — пасланцы пісьменніцкіх арганізацый Украіны, Літвы, гарадоў Масквы, Ленінграда, Яраслаўля і Горкага. У прэзідыуме знаходзіліся кіраўнікі партыі і ўрада нашай рэспублікі, вядомыя беларускія пісьменнікі, дзеячы навукі і культуры, а таксама Максімавы сваякі. Вечар адкрыў і вёў народны паэт Беларусі, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР М. Танк. Узнёслае слова пра М. Багдановіча сказаў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніл Гілевіч. Шчырыя словы любві і павагі да неўміручай спадчыны генія беларускай літаратуры засведчылі многія выступіўшыя на юбілейным вечары. Як і належала ў такім выпадку, свята закончылася добра падрыхтаваным канцэртам майстроў беларускага мастацтва, у кожным нумары якога панаваў дух Максіма Багдановіча.

Напярэдадні, 8 снежня 1981 года, у рэспубліканскім Палацы мастацтва пры сцячэнні соцень мінчан і гасцей сталіцы адбылося адкрыццё шматжанравай мастацкай выстаўкі, якая таксама прыўрочылася да 90-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча. Работ было шмат, не ўсе і трапілі на выстаўку, але і сярод прадстаўленых дваццаць восем твораў самых розных мастакоў прысвечаны толькі аднаму запаветнаму куточку — Ракуцёўшчыне на Маладзечаншчыне. На палотнах у розных кампазіцыях адлюстраваны памятныя мясціны паэта ў Мінску, Гродне, Ялце, крыху менш у Яраслаўлі і Горкім. Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што ўзнёслая паэзія М. Багдановіча і яго даволі драматычнае жыццё натхнілі і па-асабліваму захапілі мастакоў, што і вылілася ў іх мастацкім увасабленні вобраза Вялікага Песняра. На выстаўцы былі прадстаўлены эскізы мяркуемай экспазіцыі мемарыяльнага музея паэта, што таксама дало маг-

чымасць пачуць усе заўвагі і калектыўна ўлічыць пры практычным ажыццяўленні мастацкага вырашэння задуманых планаў.

Урачыстасці з выпадку 90-годдзя паэта прайшлі ў розных навучальных установах і ўстановах культуры Мінска, у абласных і некаторых раённых цэнтрах. Нельга не ўспомніць добрых свят паэзіі на філалагічным факультэце БДУ імя У. І. Леніна, у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна. Рэдкае па прыгажосці Багдановічава свята прайшло ў Маладзечне, дзе мясцовыя энтузіясты-мастакі і работнікі культуры афармілі вялікую выстаўку ў стылі вядомай паэтавай кнігі «Вянок». На свяце прысутнічала шмат гасцей. Кожны ўдзельнік маладзечанскага вечара атрымаў памятны значок «Максім Багдановіч», таксама з густам выкананы тутэйшым мастаком.

Знакаміты багдановічаўскі «Вянок» (1913) ужо даўно сам стаў помнікам, бо хіба ў музеях можна ўбачыць гэты зборнік паэзіі. І як прыемна, што выдавецтва «Мастацкая літаратура» і ў гэтым плане паклапацілася, выпусціўшы да 90-годдзя паэта факсімільнае выданне. Будзе памяткай для прыхільнікаў творчасці Максіма Багдановіча грампласцінка з песнямі на словы паэта, як і паштоўка, па-майстэрску зробленая Пятром Драчовым і Валянцінам Ждановічам.

У Гродне рэстаўрыруецца домік, у якім да 1896 года жыла сям'я Багдановічаў, дзе ў недалёкім часе таксама павінен адкрыцца мемарыяльны музей паэта. Добрых слоў варты энтузіязм гродзенскіх мастакоў, асабліва Уладзіміра Церабуна, якія на грамадскіх пачатках вырашылі ўстанавіць помнік на магіле маці Максіма Багдановіча — Марыі Апанасаўны.

Усё вышэй сказанае пра юбілейную ўрачыстасць — гэта генеральная рэпетыцыя да стогадовага юбілею Максіма Багдановіча, які, трэба меркаваць, будзе ўсебеларускім, усеславянскім, сусветным.

*
* *

Вядомы культурны дзеяч Паўліна Вікенцьеўна Мядзёлка некалі раіла мне схадзіць і запісаць успаміны ад старэйшай настаўніцы Ксеніі Іванаўны Мілановіч (1896—1981), якая ў пасляваенны час жыла ў Маладзечне. Ксенія Іванаўна таксама сустракалася з Максімам Багдановічам, і яе ўспаміны могуць быць карыснымі.

— З беларускай літаратурай я пазнаёмілася ў Радашковічах у 1909 годзе, калі ўпершыню ў маім жыцці трапіўся рукапісны сшытак беларускіх вершаў розных аўтараў, які зрабіў на мяне і маіх сяброўак найвялікшае ўражанне. Там былі творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Францішка Багушэвіча і іншых аўтараў і, здаецца, Максіма Багдановіча. У нас той сшытак доўга не затрымаўся, мы яго перапісалі і далей множылі, перапісвалі мае браты, сястра, сяброўкі і перадавалі іншым. Няхай усе ведаюць і чытаюць па-нашаму, па-тутэйшаму, па-беларуску. У блізкім часе мы ўжо спазналіся з «Нашай нівай». І тут я чытала высокамастацкія вершы Максіма Багдановіча, творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Буйло...

Далей К. І. Мілановіч (дзявочае прозвішча Юзвюк — Г. К.) расказала, што ў час першай сусветнай вайны іхняя сям'я эвакуіравалася ў Сумы, але беспрытульнасць у чужых краях вымусіла вярнуцца ў Мінск, жыць спачатку ў сваіх знаёмых Каткоўскіх. Сама Ксенія Іванаўна ўжо мела адпаведную адукацыю і працавала настаўніцай у дзесятым прыходскім вучылішчы Мінска.

— Дачка Каткоўскіх — Шура Смоліч — жыла з мужам на Старажоўцы. Я часта бывала ў іх. Тут не раз сустракала Змітрака Бядулю, а таксама і Максіма Багдановіча. Выгляд у паэта быў нездаровы. Усе мы непакоіліся. Хацелі неяк яму дапамагчы, зрабіць ласку. Усім нам ён падабаўся.

Аднойчы я прыйшла да сваёй сяброўкі. Шура завіхалася на кухні, ладзіла полудзень.

— Гатую аўсяны кісель, усіх пачастую. Максім таксама любіць.

Сабраўшыся ля стала, мы ўсе са смакам частаваліся Шурыным кісялём.

Ішла гутарка пра добрых людзей-жыццялюбаў, якія, нягледзячы на трывожна-маркотны час, марылі аб светлым дні. Максім Багдановіч ажыўляўся, уступаў у гутарку, яму такое заўсёды імпанавала. Задушэўны і шчыры, ён таксама марыў аб шчасці роднай старонкі, каб людзям спакойна жылося, каб Беларусь была роўнай сярод усіх краін свету. Была я ў Шуры і тады, калі ў яе з'явіўся сын.

— Як жа імя? — спыталася я.

— Максім.

— Чаму ж так проста, усё роўна як Мікіта?

— Ведаеш, Аксінька, гэта па імені Максіма Багдановіча, нашага слаўнага беларускага паэта.

— А, калі так, то хвалю.

Памяць пра Максіма Багдановіча Ксенія Іванаўна Мілановіч захоўвала ўсё жыццё. І разам з усімі горка аплаквала яго раннюю смерць. Пазней яна працавала на дзіцячай пляцоўцы «беларускай хаткі», сустракала нямала розных беларускіх пісьменнікаў і ўсіх заўсёды прымяркоўвала да інтэлекту Максіма Багдановіча.

— У адносінах Янкі Купалы да дзяцей і да людзей увогуле, — успамінала Ксенія Іванаўна, — мне заўсёды ўгадваўся Максім Багдановіч: тая ж самая шчырасць, бацькоўская замілаванасць, пяшчотнасць, уменне радавацца ўсяму добраму, чалавечаму.

К. І. Мілановіч не пісьменніца, яна радавы работнік асветы. Але яе ацэнкі М. Багдановіча і адносіны да яго як найлепш характарызуюць любоў простых людзей да свайго паэта.

*
*    *

І колькі часу не пройдзе, Багдановіч будзе лепшай памяццю Беларусі і застанецца такім светлым, чыстым, як сумленне народа. На карце нашай рэспублікі з'явіліся і яшчэ з'явяцца помнікі, вуліцы, школы, бібліятэкі. І гэта даніна павагі да велічы Максіма Багдановіча.



Дзяржаўная
бібліятэка
Б С С Р

На 1, 2, 3 і 4-й старонках вокладкі:
*Помнік М. Багдановічу ў Мінску*
*Ракуцёўшчына. Сучасны выгляд хаты, у якой жыў паэт у*
*Вёска Ракуцёўшчына*
*Ракуцёўскі краявід*

B000000002483895



ГЕННАДИЙ АЛЕКСАНДРОВИЧ КОХАНОВСКИЙ

**В РОДНОМ КРАЮ**

На белорусском языке

Рэдактар **Н. І. Навумава**. Мастацкі рэдактар **Л. І. Бятанаў**.
Тэхнічны рэдактар **Т. А. Тарасенка**. Карэктар **Е. К. Юркевіч**.

Н/К

Здадзена ў набор 18.08.82. Падпісана ў друк 27.01.83. АТ 07061. Фармат 60×84[1]/[16]. Папера мелаваная. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 0,93. Ум. фарб.-адб. 1,86. Ул.-выд. арк. 1,41. Тыраж 750 экз. Выд. № 2523. Зак. 2521. Цана 15 кап. Заказное.
Выдавецтва «Полымя» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11.
Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, В. Таўлая, 11.